**Гарматны В.П.**

# ПУБЛІКАЦЫІ МІЖВАЕННАГА ПЕРЫЯДУ АБ ТЭХНІЧНЫМ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ КАМАСАЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Камасацыя – гэта адна з галоўных складовых частак аграрнай рэформы, якая ажыццяўлялася польскімі ўладамі на землях ІІ Рэчы Паспалітай, і найперш за ўсё Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з мэтаю ліквідацыі цераспалосіцы і інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі. На пачатак 1920-х гг. у многіх заходнебеларускіх сялян налічвалася па некалькі невялікіх зямельных надзелаў, размешчаных у так званым шахматным парадку, аддаленых часам нават на некалькі кіламетраў. Гаспадаранне на такіх шматлікіх раскіданых надзелах зямлі, было вялікаю і марнаю стратаю сіл і часу селяніна, стварала падставу для ўзнікнення канфліктаў паміж суседзямі. У цэлым камасацыя вылілася ў аб’яднанне раскіданых надзелаў з улікам іх грашовай вартасці з перанясеннем сюды хаты і стварэннем такім чынам хутара [1, s. 162].

Першыя падрыхтоўчыя мерапрыемствы па камасацыі былі ажыццёўлены польскімі ўладамі на заходнебеларускіх землях яшчэ на працягу 1919 г., але сістэмнае яе правядзенне стала магчымым толькі пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага міра, у выніку падпісання якога Заходняя Беларусь трапіла ў склад ІІ Рэчы Паспалітай (міжваеннай Польшчы). Галоўнымі законамі, якія рэгламентавалі ажыццяўленне камасацыі сталі закон ад 31 ліпеня 1923 г. “Аб аб’яднанні зямель” [17] і ад 14 студзеня 1927 г. “Аб аказанні дзяржаўнай крэдытавай дапамогі пры аб’яднанні зямель” [15]. Разам з тым, дзеля паспяховага ажыццяўлення камасацыі дзяржаўным уладам прыйшлося прыняць шэраг дадатковых удакладняючых пастаноў і распараджэнняў, якія былі сабраны ў спецыяльна выдадзеных зборніках [16; 18].

Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 1½-2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі патрабуемай нарматыўна-прававой і тэхнічнай дакументацыі і, пры магчымасці, па надзяленні дадатковаю ворнаю зямлёю мясцовых беззямельных і малазямельных сялян, а таксама тых, якія пераносілі на новае месца асабістыя гаспадарчыя будынкі. За сезон два кваліфікаваныя інжынеры-землямеры з дапаможным персаналам маглі ажыццявіць памер 1 000 га на абшары некалькіх гмін, у той час як для высвятлення ўсіх маёмасных абставін справы аб’яднання зямель патрабавалася б дзейнасць некалькіх юрыстаў [11, s. 127]. У сваёй дзейнасці землямеры ў першую чаргу павінны былі кіравацца тэхнічнай інструкцыяй Міністэрства сельскагаспадарчых рэформ (МСГР) ІІ Рэчы Паспалітай ад 13 лютага 1925 г., якая рэгламентавала працэдуру аб’яднання зямель, акрэслівала ўмовы дзейнасці землеўпарадчыкаў, умовы і характарыстыку неабходных дакументаў па камасацыі [14].

У працы Б. Дваракоўскага і Э. Ясінскага [3] на аснове закона ад 31 ліпеня 1923 г. падрабязна раскрываецца ход працэдуры аб’яднання зямель, прыведзены прыклады дакументаў, якія былі неабходны пры тэхнічным ажыццяўленні камасацыі, падкрэсліваецца, што без камасацыі немагчыма паляпшэнне агульнай аграрнай культуры [3, s. 3]. Як адзначалі самі аўтары разглядаемага выдання, да гэтага (да 1928 г.) не было выдадзена адзінай кнігі, якая б інфармавала вясковае насельніцтва аб спосабах і ўмовах ажыццяўлення камасацыі, таму мэтаю іх брашуры стала ліквідацыя гэтага прабела і падрабязнае інфармаванне зацікаўленых асоб аб перавазе камасацыі.

Рэпазіторый ВГУ

Неабходна адзначыць, што Б. Дваракоўскі і Э. Ясінскі цалкам выканалі пастаўленую перад імі задачу і іх даследаванне з'яўляецца самаю каштоўнаю крыніцаю звестак аб тэхнічным ажыццяўленні камасацыі.

У працы В. Крыштофіка [9] на прыкладзе вёскі Ясенюўка Сакольскага павета Беластоцкага ваяводства паказаны ход ажыццяўлення тэхнічных работ па камасацыі асобнай вёскі, разглядаецца станоўчы ўплыў хутарызацыі на далейшае развіццё мясцовай сельскай гаспадаркі дзякуючы канцэнтрацыі землеўладання і ўпарадкавання землекарыстання.

У. Кемпінскі разглядае ў сваёй брашуры [7] цяжкае становішча сельскай гаспадаркі II Рэчы Паспалітай, якое ў многім было выклікана захаваннем значнай колькасці перажыткаў з часоў паншчыны, адным з галоўных з якіх была цераспалосіца, адзначае, што камасацыя магла б вырашыць многія злабадзённыя праблемы, разам з тым для яе поспеху неабходна было надзяленне малазямельных сялян дадатковаю ворнаю зямлёю, але ва ўладаў адсутнічаў дастатковы зямельны фонд [7, s. 7-9, 17].

Ст. Клужняк падкрэслівае, што камасацыя з'яўляецца складанай, працаёмкай працэдурай, з дапамогай якой сельскай гаспадарка II Рэчы Паспалітай можа атрымаць значны штуршок для далейшага развіцця, паспрыяць ліквідацыі ранейшага "хаоса" ў землеўладанні [8, s. 57]. У азначанай працы паслядоўна распісана працэдура ажыццяўлення камасацыі, паказаны асноўныя цяжкасці, якія могуць сустрэць землямера на гэтым шляху. Даследчык падкрэслівае цесную сувязь камасацыі з парцэляцыяй – падзелам і продажам сялянам часткі зямель з памешчыцкіх маёнткаў, але магчымасці польскага ўрада ў гэтым плане былі вельмі істотна абмежаваны з-за дэфіцыту і высокага кошту ворнай зямлі.

Вялікую ўвагу камасацыі ў сваёй працы надае К. Касінскі [6], тагачасны дырэктар дэпартамента МСРГ II Рэчы Паспалітай. Як падкрэсліваецца ў даследаванні, камасацыя была адным са сродкаў, з дапамогаю якога можна было б выправіць памылковае становішча ў аграрнай сферы краіны [6, s. 3]. Дзеля поспеху палітыкі камасацыі неабходна было праводзіць яе комплексна, у цеснай сувязі з парцэляцыяй і меліярацыяй. Касінскі падкрэслівае, што ажыццяўленне камасацыі патрабавалася на абшары каля 10000000–12000000 га, пры чым азначаную справу ўлады планавалі выканаць на працягу не менш 20–25 гадоў, што было абумоўлена абмежаванымі гаспадарчымі і эканамічнымі магчымасцямі дзяржавы [6, s. 11]. Даследчык прааналізаваў ажыццяўленне камасацыі ў некаторых вёсках і паказаў выгады і магчымасці для далейшага рацыянальнага вядзення асабістай гаспадаркі, якія ўзнікаюць ва ўладальнікаў ужо скамасаваных гаспадарак [6, s. 14–15]. Аўтар азначанай кнігі падкрэслівае значную ролю і вялікую адказнасць ажыццяўляючых работы па камасацыі землямераў, у сувязі з чым звяртае асаблівую ўвагу на неабходнасць справядлівага і якаснага выканання імі сваіх абавязкаў для агульнай грамадскай карысці.

Надзвычай важнае значэнне ў выкананні работ па камасацыі павінны былі адыгрываць мясцовыя ўлады як найбольш набліжаныя да вясковага насельніцтва і ведаючыя яго ўмовы жыцця і асноўныя патрэбы. Дзейнасці нізавых зямельных камісій і гмінных упраў пры правядзенні работ па камасацыі прысвечана наступная праца К. Касінскага [5], дзе падкрэсліваецца, што калі першапачаткова ажыццяўленне камасацыі асобнай вёскі зацягвалася на 3–5 гадоў, то з цягам часу дзякуючы некатораму ўдасканаленню працэдуры камасацыі і назапашванню надзвычай карыснага вопыту тэрміны скараціліся да 1½ гадоў [5, s. 39]. Надзвычай карысным для сялян пры камасацыі было б іх надзяленне дадатковаю ворнаю зямлёю, але зрабіць гэта можна было далёка не заўсёды. Некаторыя аспекты дзейнасці гмінных камісій пры ажыццяўленні камасацыі раскрыты ў працы Б. Гілічынскага [4].



Рэпазіторый ВДУ

Значную цяжкасць пры камасацыі ўяўляла незадаволенасць заходнебеларускіх сялян атрыманым пры аб'яднанні зямель надзелам і спадзяванні атрымаць дадатковую зямлю, што значна зацягвала яе тэмпы. Як адзначалася ў 1935 г. у рэдакцыйным артыкуле часопіса "Wieś" ("Вёска", № 1-2): "Здавалася б, што гаспадарка дзяржаўная нічога на тым не згубіць, калі (пры камасацыі) Барташ штосьці страціць, а Мацей атрымае. Калі б праводзіць працу такім чынам, то яна б паскорылася ў некалькі разоў" [12, s. 22].

Б. Дэдэрка ў сваёй кнізе звяртае ўвагу, што некаторыя сяляне, ведаючы, што іх землі павінны ў выніку камасацыі перайсці да іншага ўладальніка, свядома ўдзялялі ім менш увагі і наогул запускалі, што стварала новым гаспадарам вялікія цяжкасці [2, s. 1]. Многія з вяскоўцаў лічылі, што камасацыя аўтаматычна паляпшае іх матэрыяльнае становішча і таму працягвалі на новым надзеле весці гаспадарку па-старому, у той час як на самой справе яна, перш за ўсё, стварала для гэтага надзвычай спрыяльныя ўмовы. Даследчык падкрэслівае неабходнасць павышэння агульнай сельскагаспадарчай культуры, заахвочвання сялян да ўкаранення передавых метадаў апрацоўкі зямлі, а не механічнага павелічэння плошчы апрацоўваемых зямель.

У працы Е. Мейера [10] паказана становішча скамасаваных гаспадарак Заходняй Беларусі і ўплыў камасацыі на паляпшэнне матэрыяльнага становішча сялянства. Даследчык адзначае, што камасацыя спрыяла павышэнню ўраджайнасці дзякуючы магчымасці шырокага выкарыстання рознастайных угнаенняў і сельскагаспадарчай тэхнікі, акрамя таго, дзякуючы аб'яднанню апрацоўваемых надзелаў памяншалася колькасць неабходных для іх апрацоўкі сялянскіх працадзён.

У цэлым, як пісаў польскі інжынер Крыстын Астроўскі: "Камасацыя – сродак выпраўлення аграрнага ладу Польшчы, без якога нельга нават і думаць аб павышэнні ўраджайнасці і агульнай культуры апрацоўкі зямлі. Без яе (камасацыі) селянін не зможа стаць сапраўдным грамадзянінам дзяржавы, не будзе адукацыі і дабрабыту…" [13, s. 15]. Даследчык абгрунтоўваў вялікую адказнасць дзяржавы пры ажыццяўленні камасацыі і недапушчальнасць памылак, бо ўжо раз скамасаваныя гаспадаркі будзе немагчыма скамасаваць ізноў. Пры камасацыі суседніх вёсак лепш было б, каб іх цэнтр знаходзіўся на памежжы, а не паасобку, прапаноўвалася таксама веерападобнае размяшчэнне зямельных надзелаў, што на думку Астроўскага, спрыяла поспеху камасацыі і перашкаджала б далейшаму драбненню сялянскіх гаспадарак. Дзеля поспеху камасацыі неабходна добрая падрыхтоўка землямера, усебаковае веданне ім умоў вясковага жыцця і працы на зямлі, знаёмства з мясцовымі ўмовамі гаспадарання, вялікі вопыт і такт, каб сярод хаатычных і часта невыканальных пажаданняў удзельнікаў камасацыі знайсці найлепшы выхад [13, s. 17]. Даследчык падкрэслівае вялікае значэнне перабудовы аграрнага ладу і лічыць, што для поспеху камасацыі ў сувязі са значнаю раскіданасцю зямельных надзелаў і вялікаю колькасцю неабходных для афармлення дакументаў неабходна яе сістэмнае ажыццяўленне на як мага большым абшары, што патрабуе значных намаганняў, але адначасова як мага лепш упарадкуе ўмовы землекарыстання і будзе надзвычай карысным [13, s. 24]. Неабходнаю ўмоваю для поспеху камасацыі з'яўляецца рэгуляцыя дарожнай сеткі з мэтаю як мага лепшага праезда [13, s. 35]. Галоўным наступствам камасацыі стане стварэнне значнай колькасці эканамічна моцных і здольных для далейшага развіцця сялянскіх гаспадарак, а таксама ліквідацыя значнай колькасці праблем у аграрнай сферы і найперш за ўсё вырашэнне шматлікіх межавых спрэчак [13, s. 28-29].

Такім чынам, прааналізаваныя публікацыі ўтрымліваюць вельмі важную інфармацыю аб ходзе і ўмовах тэхнічнага ажыццяўлення камасацыі ў Заходняй Беларусі.

Рэпазіторый ВГУ

1. Гарматны, В.П. Правядзенне камасацыі ў Палескім ваяводстве ІІ Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / В.П. Гарматны // Białoruskie Zeszyty Historyczne (Беларускі гістарычны зборнік). – Беласток, 2008. – № 30. – С. 162–171.
2. Dederko, B. Organizacja gospodarstw i wsi świeżo scalonych / B. Dederko. – Warszawa : Muzeum Przemysłu i Rolnictwa, 1931. – 8 s.
3. Dworakowski, B. Wskazówki dla scalających grunty / B. Dworakowski, E. Jasiński. – Warszawa : Nakładem autorów, 1928. – 136 s.
4. Giliczyński, B. Prace urzędów ziemskich : poradnik dla członków Komisij Ziemskich ze szczególnem uwzględnieniem prac Komisij Gminnych / B. Giliczyński. – Warszawa : skład główny Gebethnera i Wolffa, 1920. – 174 s.
5. Kasiński, K. Działalność Ministerstwa Reform Rolnych i Urzędów Ziemskich w okresie od roku 1918 do 1. I. 1928 roku / K. Kasiński. – Warszawa : Przegląd Mierniczy, 1928. – 92 s.
6. Kasiński, K. Komasacje gruntów wiejskich / K. Kasiński. – Warszawa : [s. n.], 1929. – 24 s.
7. Kępiński, W. Komasacja jako podstawa naprawy ustroju rolnego / W. Kępinski. – Kraków : Towarzystwo Ekonomiczne, 1927. – 36 s.
8. Kluźniak, St. Komasacja i parcelacja / St. Kluźniak. – Lwów : Księgarnia Polska B. Połonieckiego, 1928. – 100 s.
9. Krysztofik, W. Jasienówka, wieś powiatu sokólskiego : monografia ze szczegolnem uwzględnieniem zmian wywołanych komasacją gruntów / W. Krysztofik. – Poznań : Ministerstwo Rolnictwa i Reform Rolnych, 1933. – 219 s.
10. Mejer, E. Gospodarstwa powstałe w wyniku przebudowy ustroju rolnego w województwach Wileńskim, Nowogródzkim i Poleskim w swietle cyfr z roku 1930/31 / E. Mejer. – Wilno : Księgarnia J. Zawadzkiego, 1936. – 102 s.
11. Mich, W. W obliczu wywłaszczenia: kwestia reformy rolnej w publicystyce ziemiańskiej, 1918–1939 / W. Mich. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2001. – 208 s.
12. Nowe drogi polskiego rolnictwa // Wieś (Kraków). – 1935. – № 1/2. – S. 21–23.
13. Ostrowski, K. Teorja i praktyka naszej komasacji / K. Ostrowski // Rolnictwo. – 1932. – Kwecień. – S. 15–38.
14. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 13 lutego 1925 r. o stosowaniu instrukcji technicznej do wykonywania prac pomiarowych, związanych z przebudową ustroju rolnego // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). – 1925. – № 29. – Poz. 205. – S. 240–246.
15. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14 stycznia 1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów // DURP. – 1927. – № 6. – Poz. 36. – S. 45–47.
16. Scalanie gruntów (komasacja): w świetle ustaw i rozporządzeń obowiązujących na całym obszarze Rzeczypospolitej Polskiej z wyjątkiem województwa śląskiego / oprac. St. Gozdawa-Zdziarski. – Warszawa : Dom Książki Polskiej S. A., 1930. – 101 s.
17. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050–1056.
18. Zbiór przepisów o scalaniu gruntów / zebrał i opracował H. Maciejewski. – Białystok : Nakład Białostockiego Stowarzystwo Mierniczych Przysięgłych Rzeczypospolitej, 1938. – 372 s.

Репозиторий ВГУ